# КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
Выдаецца з кастрычніка 1991 г.
№ 1 (1492)
2 студзеня 2021 г.





# Ледзяныя сполахі полымя





...Феерыя халодных перапляценняў, шматколернасць бліскавіцаў, чароўныя фантазійныя карункі і сюжэты — усё гэта беларускае мастацкае шкло, унікальная з'ява ў нашым культурным жыцці. Пачынаючы яшчэ ад традыцый мануфактур Радзівілаў, гэты від творчасці на нашых землях набыў высокі аўтарытэт, урэшце і не толькі на іх: славіліся тагачасныя шкляныя творы мастацтва далёка за межамі Беларусі. Уласна кажучы, гэтаксама як і ў наш час. Майстры найвышэйшага класа шклозаводаў "Нёман" і адпаведна Барысаўскага, якія ад пачатку 1960-х паспяхова працуюць ў творчых лабараторыях і сёння, прэзентуюць свету найноўшыя ўзоры айчыннага мастацкага шкла.

Мінаюць гады. Змяняюцца пакаленні майстроў. Удасканальваюцца тэхніка і тэхналогія вытворчасці. Але па-ранейшаму заварожвае чароўнае пераўтварэнне пяску, соды і мелу ў празрыстыя, бліскучыя шкляныя вырабы, бо шкло — па-сапраўднаму чароўны матэрыял, без якога наша жыццё не было б такім упрыгожаным. Менавіта таму мы і прапануем наш традыцыйны навагодні каляндар, які прадстаўляе калекцыю з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

К




ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 1 / 2 СТУДЗЕНЯ 2021 г.


# Беларускі народны каляндар на 2021 год

*Народны каляндар — гэта фальклорны каляндар, у якім захаваны прыродна-храналагічныя веды народа. У яго аснове хранонімы, якія зафіксаваны ў вуснай народнай творчасці беларусаў.*

*Сістэматызаваны беларускі народны каляндар у складзе з велікодна-валачобнымі песнямі, якія ў строгай храналагічнай паслядоўнасці апісваюць традыцыйныя прысвяткі і святы ў тым ліку тыя, што законсерваваліся ў непараўнальных паэтычных узорах як Навагоддзі / Навалецці, з'яўляецца нашым шэдэўрам і фенаменальнай з'явай сусветнай нематэрыяльнай культуры.*

***У народным календары на 2021 год прадстаўлены асноўныя святы і прысвяткі з кароткімі тлумачэннямі, прыкметамі, прымаўкамі, урыўкамі з валачобных песень і гэтак далей. Дні (хранонімы), якія адзначаюць беларусы-католікі, выдзелены курсівам. Зорачкай /*/ пазначаны святы "рухомай" царкоўнай пасхаліі.***

*У наступным, 2022, годзе па каталіцкай пасхаліі Вялікдзень (Пасха) 17 красавіка і па праваслаўнай — 24 красавіка.*

*Умоўныя абазначэнні: п — панядзелак, а — аўторак, с — серада, ч — чацвер, пт — пятніца, сб — субота, н — нядзеля. Больш падрабязна пра значэнне хранонімаў календара можна прачытаць у нашых кнігах "Беларускі народны каляндар" (Мінск, 1993, 2002) і іншых.*

## Студзень

**1. пт. Новы год.** ВКЛ перайшло на студзеньскі стыль у 1550 г., Расія — у 1700 г.

**6. с. Першая, Посная куцця**. Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. ***Багаз'яўленне, Тры Каралі***. Католікі праводзілі маскіраваны абрад "Тры каралі", або "Гэроды".

**7. ч. Раство Хрыстова.** Пачатак **Каляд.** "Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі..." Калядавалі. Насілі "звязду". Паказвалі батлейку. На Каляды праводзілі ігрышчы ("вадзілі казу", "жанілі Цярэшку", "пяклі ката", гулялі ў "Яшчура" і іншае).

**9. сб. Сцяпан.** Дзень найму слуг, батракоў у мінулым. "На святога Сцяпана вышэй слуга за пана".

**13. с. Шчодрая куцця.** Пачатак **Шчодрага тыдня.** "Мароз, хадзі куццю есці"

**14. ч. Васілле. Новы год** па праваслаўнаму календару. "Сею, сею пасяваю, з Новым годам вас вітаю".

**18. п. Трэцяя, Галодная, Вадапосная куцця.** Апошнія дні Каляд. "Каляда ад'язджае".

**19. а. Вадохрышча (Кшчэнне).** "Святое Кшчэнне ваду ксціла..., свет ачысціла і ваду наверх пусціла", "На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама".

**20. с. Прывадохрышча** — заканчэнне Каляд. Пачатак **Малой вясельніцы** (да посту).

**24. н. *Аксіння.*** "Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце". **Фядос.** "На Фядоса цёпла".

**25. п. Таццяна.** Свята студэнтаў. ***Павел.*** "Вее вецер — будзе вайна".

**31. н. Апанас, Гусінае свята.** Свята свойскай жывёлы. "Хавай нос у апанасаўскі мароз".

## Люты

**1. п. *Ігнат.*** "На Святога Ігната зіма багата".

**2. а. *Грамніцы, Стрэчанне.*** "Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы", "Грамніца — хлебу палавіца".

**5. пт. *Агата.*** Каровіна свята. "Хлеб і соль святой Агаты не пусціць бяды да хаты".

**6. сб. *Дарота.*** "Па Дароце высахнуць хусты на плоце". **Паўзіміца Аксіння.** "На Аксіні мяце".

**11. ч. Ігнат.** "Ігнат Грамніцам рад".

**12. пт. *Стрэчаньскія Дзяды.**

**14. н. *Валянцін.*** Свята закаханых. **Трыфан.** "На Трыфана зорна — вясна позняя".

**15. п. Грамніцы, Стрэчанне.** "Зіма з летам сустракалася, пра здароўейка пыталася". "На Грамніцы палавіна зіміцы".

**17. с. **Серада Папяльцовая*** (пач. Вялікага посту ў католікаў, да 3.04).

**18. ч. Агата.** Каровіна свята.

**24. с. *Мацей.*** "На Мацея дарога пацее", "На Мацея адліга - будзе мароз". **Уласcе.** Свята жывёлы. "Аўлас на сыры лас".

**26. пт. Фаціння.** Заступніца ад хвароб (ліхаманак, трасцы і іншага).

## Сакавік

**1. п.** Пачатак ***Памінальнага, Дзедавага тыдня.**

**4. ч. *Казімір.*** "Святы Казімір дровы сякець і ў клад кладзець".

**5. пт. * Дзедава пятніца.**

**6. сб. *Памінальніца.** Канец Памінальнага тыдня. Калі "вея" ў нядзелю, то авёс трэба сеяць на 9-м тыдні, калі ў панядзелак — то на 8-м, калі ў сераду ці чацвер — то пакідалі "дзесяцінкі дзве".

**8. п. *Рабы тыдзень, Вясельніца, Развітальны, Сырапусны, Масленічны тыдзень.** Тыдзень перад Масленіцай. Які добры дзень на Масленым тыдні, у той дзень ад Іллі сеялі лён. Дзяўчаты вешалі "калодкі" не жанатым хлопцам. ***Дзень сустрэчы** на Масленым тыдні.

**9. а. *Заляцанне** на Масленым тыдні. **Янка, Паўраценне.** Мядзведзь паварочваецца ў бярлозе на другі бок.

**10. с. *Лысая серада.** Пратальнызалысіны.

**11. ч. *Блакітны чацвер.** Туманоывы дзень. ***Крывы, Тлусты чацвер, Валосы, Валосся.** Свята жывёлы. "На Валосага бліны пяклі ці аладкі, каб былі валы гладкі".

**12. пт. *Цешчыны вечары. *Рыгор.*** "На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора".

**13. сб. *Масленыя Дзяды (Бабы).** "Дзяды не зналі бяды, а нашы ўнукі зазналі мукі". ***Залвіцыны вячоркі. Васіль Капальнік.** Са стрэх капае.

**14. н.** ***Масленіца.** "Масленіца ў "вятху" (пасля поўні) — дзяржы пшаніцу ў мяху, сей пшаніцу на ўсю руку". ***Развітальны, або Дараваны дзень. *Гуканне вясны.** "Блаславі, божа, зіму замыкаці, вясну загукаці". На Палессі вадзілі карагоды, "спявалі чырачку", насілі ёлку з вянком. **Аўдоцця Вясноўка. Гуканне вясны.** "На Аўдокі голы бокі". (1.03 Новы год /Новае лета) у мінулым, сакавіцкі каляндарны стыль). "Святы Еўдакей ... пераступ года".

**15. п. *Паласказуб.** Першы дзень Вялікага посту (да 1.05). Паласкалі зубы гарэлкаю. **Хвядот.** "На Хвядота занос — усё сена знясе".

**17. с. *Уступная серада.** Каб урадзіў лён, мылі верацёны ці калаўроты, хадзілі ў карчму і пераскаквалі цераз пень. **Герасім Гракоўнік.** "Герасім гракоў прыгнаў".

**19. пт. *Язэп.*** "Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту" (забарона на шлюб). "На Язэпа пагода — год ураджайны".

**20. сб. *Зборава субота.** Абрад "споведзі дзежкі". *Веснавое раўнадзенства ў 09.37 г.*

**21. н.** ***Зборніца, Ізбор.** Адзін з варыянтаў Новага года / лета ў час прыняцця юліянскага летазлічэння. "Святы Ізбор упярод ступіць". Пачатак збору селяніна ў поле.

**22. п. Саракі.** Было Новым годам / летам. Свята вясновага раўнадзенства. "Дзень з ноччу мераецца". "Святыя Саракі наперад пайшлі". Свята птушак. Прылятае 40 выраяў. "Святыя Саракі ў поле саху валаклі". **Пліска**. "На святога Пліска праб'ець лёд і пліска".

**25. ч**. ***Дабравешчанне, Звеставанне.*** "І птушка гнязда не кладзе". Прылёт бусла. Гуканне вясны. Было Новым годам / летам. "Перша свята — нова летца, Благавешчан зямлю сушыць". **Рыгор.** "На Рыгора зіма ідзе ў мора".

**26. пт. Міжблагавешчыны** (да 7 красавіка). Забарона на "запасванне" кароў.

**28. н.** * ***Пальмова нядзеля.*** "Вярба б'е, не я б'ю".

**29. п.** *Пачатак **Храстовага тыдня.** Пяклі "храсты". Засеўкі. Абрад "жаніцьбы коміна".

**30. а. Аляксей Цёплы.** Дзень рыбалова. "На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бортнік на хвою".

## Красавік

**1. с. Дар'я Вясенняя.** Адбельвалі палотны.

**4. н.**ВЯЛІКДЗЕНЬ*** у католікаў.

**5. п. *Арына.*** "На Арыну сей капусту ў расадніках".

**6. а. Камаедзіца.** Свята мядзведзя. **Благавеснік.** Пяклі пірагі "буславы лапы".

**7. с.** ***Серадапосце.** Выпякалі "храстцы". **Благавешчанне**. "Благавешчанне без ластавак — халоднае лета". Абрад "Страла".

**8. ч. Благуста.** "На Благусту сей капусту".

**9. пт. Матрона.** "На Матрону шчупак хвастом лёд разбівае".

**12. п.** Пачатак ***Пахвальнага тыдня.** "Дзікая качка яйцом пахваліцца".

**14. с. Прабуджэнне хатніка.** У гэты дзень хлусілі, каб заблытаць хатніка "Апрэль — нікому не вер". **Мар'я.** Калі ў ясную н[illegible] прыбывала вада, то суха б[illegible] дзе ў жніво на хлебнай ні[illegible]

**15. ч. Палікарп.** "Па[illegible] так бясхлебіцы".

**16. пт. *Пахвальная п[illegible]ніца.** Мыццё дзежак. **М[illegible]кіта.** "Калі на Мікіту кр[illegible] гаход, то няма ні клёву, [illegible] лову рыбаловам".

**17. сб. *Пахвальная субота.** Не грымелі кроснамі, каб гром не грымеў.

**21. с. Руф.** Руф рушыць снягі.

**23. пт. *Юры.*** (Новы год па задыяку). "Першае святца — святы Юр'я", "Як зязюля закукуе за 12 дзён да Юр'я на "голы" лес, то не чакай ураджаю і будзе хварэць жывёла". ***Войцах.*** "Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху".

**24. сб. Анціп —** ахоўнік зубоў.

**25**. **н.** ***Вербніца.** ***Марк.*** "Дождж на Марка, дык зямля як шкварка".

**26. п.** Пачатак ***Белага, Вялікага, тыдня. *Чысты панядзелак.** Бялілі і мылі ў хаце.

**27. а. *Чысты аўторак.** Каб на людзей і "гаўядо" не напала "парша", трэба ўсё мыць.

**28. с.** ***Дравяная страсць.** Мыюць усё драўлянае. **Пуд.** "Пуд снег пугне".

**29. ч.** ***Чысты чацвер.** Ідуць у лазню. Абрад мыцця дзежкі. **Арына.** "На Арыну сей капусту на расаду".

**30. пт.** ***Чырвоная, Велікодная, пятніца.** Сеялі гарох. **Зосім** — ахоўнік пчол. **Андрыянава ноч, Андрэй.** Ноч дзявочай варажбы і чараўніцтва.

## Травень

**1. сб. *Вялікая, Чырвоная, субота.** Фарбавалі яйкі. Канец Вялікага посту. **Кузьма.** "Май Кузьма з морквінай сустракае, а Пахом з гурком".

**2. н. *ВЯЛІКДЗЕНЬ.** "Хрыстос уваскрос! — Сапраўды ўваскрос!" Быў Новым годам. "Першае свята — свята Вялікадня".

**3. п.** Працяг ***Вялікадня.** "Першы дзень пірагі маюць, а сярэдні пагуляюць, а паследні дзень выпраўляюць".

**5. с. *Градавая серада**. **Праводны, Мёртвы, тыдзень.** "Пайшла зіма да Кіева, а лета нам пакінула". **Ляльнік.** Свята Лялі — дачкі Лады. "Благаславі, маці, / Ой, Лада, маці! / Вясну заклікаці".

**6. ч. *Людавы дзень.** Раней у Віленскай губерні білі і качалі яйца з лубкоў, гушкаліся на арэлях. ***Вялікадне мёртвых (Наўскі Вялікдзень, Мёртвы Вялікдзень, Наўскі чацвер).** Дзень памінання на могілках. Хлопцы і дзяўчаты абліваліся вадой. **Юр'е.** Свята жывёлы. "Як дождж на Юр'я — хлеб будзе і ў дурня" Абрад "Страла".



**7. пт. *Прашчэнне.** Абліваліся вадой. **Алісей.** «Прыйшоў Алісей - авёс пасей». **Бабскія розбрыкі.** Скокі жанчын і качанне па зямлі дзеля ўрадлівасці.

**8. сб. *Станіслаў.*** «Сей лён на Станіслава — вырасце як лава». **Марк.** «Дождж на святога Марка — дык зямля, як шкварка». **Ярылавіца.** Свята Ярылы.

**9. н. *Праводная нядзеля.** «Ідзі, зіма, да Кучава, як ты нам надакучыла».

**10. п. *Радаўнічныя Дзяды.**

**11. а.** ***Радаўніца.** «На Радаўніцу да абеду пашуць, па абеду плачуць, а к вечару скачуць».

**13. ч.** ****Ушэсце.*** Унебаўшэсце пана Езуса. Свята агляду жыта. **Якуб.** «На Якуба грэе люба».

**14. пт. Макарэй.** Абрады ля вады.

**15. сб. Барыс**. Апякун поля і жывёлы.

**18. а. Арына Расадніца.** Дзень высаджвання расады ў Паазер'і.

**20. ч. Антоній.** «На святы Антоній сей авёс для коней, а як удасца дык і прадасца».

**21. пт. Іван Веснавы**. Апякун земляроба. «На Івана каласок, а на Пятра піражок».

**22. сб. Мікола Веснавы.** Свята пастухоў. ***Алёна.*** «Сей лён на Алену, будзе кашуля па калена».

**23. н.** ****Сёмуха, Зялёныя святкі, Святы Дух.*** Свята зелені. «На Духа будзе цёпла і суха».***Міраносцы.** «На Міраносця п'яныі бабы цігаюць адна адну за валосця». **Зілот.** «Сей пшаніцу на Зілота, і яна будзе як злота».

**24. п.** Пачатак ***Пераплаўнага, Чарвівага, тыдня.** Не трэба садзіць, бо заядуць чэрві. **Макей.** «Мокра на Макея — і лета не прасушыць». **Кірыла і Мяфод.** Калі дзень мокры — і лета будзе мокра.

**25. а. Епіфан.** «На Епіфана раніца ў чырвоным каптане, неба з барваю — гарачае лета».

**26. с. *Градавая, Пераплаўная, серада.** Засцярогі ад граду і дажджу.

**27. ч. Сідары.** «Прыйшлі Сідары — прыйшлі і сіверы».

**28. пт. *Градабойцы, Ледавіты дзень** (Віленская губ.). **Пахом.** «Святы Пахом павее цяплом». «Сей агуркі на Пахом — будзеш насіць мяхом».

**29.сб.** ****Троіца. Магдалена.*** «М. зязюльку прысылае».

**31. п. Шэсць дзеў.** «Лён сей позні». **Канапелька Матруна.** «У зямлю махнула». **Фядот.** «Як на дубе апушка — у Фядота поўна аўса кадушка».

## Чэрвень

**2. с. Тры пакутнікі.** «Няма лета, але пасля іх не бывае зімы».

**3. ч. Алёна, Ульяна.** Дзень ільну.

**4. пт. Васіліск.** «Ад Васіліска і салавей блізка».

**5. сб. Дзень Ефрасінні Полацкай.** Хадзілі ў Полацк пакланіцца і абракацца.

**7. п. Ян.** «Рой перад Янам — пчаляр будзе панам».

**10. ч. *Ушэсце.** Абрад «Страла».

**13. н. Ерамей. *Антоній.*** «Антоні, аддай коні».

**14. п. Юстын і Харытон.** «Юстын цягне ўверх каноплі, а Харытон — лён».

**16. с.** ***Градавая серада. Лук'ян.** Паўднёвы вецер на Лук'яна — на добры ўраджай яравых.

**18. пт.** ***Сёмушныя Дзяды.**

**19. сб. *Духавая субота, Зялёная субота.** Свята маладой зелянiны. «Завівалі» вянкі, бярозкі.

**20. н. *Сёмуха, Тройца.** Культ продкаў і раслiннасці. «Павядзём Куста пад гай зялёненькі...»

**21. п. *Русальніца, Іван ды Мар'я.** Праводзіны вясны. «На Граннай нядзелі Русалкі сядзелі...». **Тодар.** «На Тодара раса — канапель паласа». *Летняе сонцастаянне ў 03.32 г.*

**22. а**. ***Конскі Вялікдзень.** Свята коней. **Кірыла.** Пачыналі касавіцу ў Паазер'і.

**23. с. *Градабой, Серада Русаль.** Здабывалі з ясеня святы агонь. ***Купала.*** У старажытн. — Новы год / лета.

**24. ч. *Наўская Тройца, Абліваха.** Памінанне продкаў на могілках. ***Ян Купальны.*** «Сонца грае».

**25. пт. Анапрэй.** «Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ».

**26. сб. Акуліна Грачышніца.** Сеялі грэчку. **Задзярыхвост.** Каровы «зыкуюць».

**27. н.** ***Русальчыны розыгры.** Засцерагаліся рос. ***Пятроўскія запускі**. Развівалі вянкі.

**28. п. *Пятроўка, Петравіца.** Пятроўскі пост да 11 ліп. Пятроўка-галадоўка. **Амос.** «Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс».

**29. а. Ціхан.** «Пеўчыя птушкі заціхаюць». ***Пятрок.*** «Да Пятра зязюльцы кукаваці». «Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілья — ападуць і два».

## Ліпень

**1. ч.** ***Дзявятнік.** Перавод уніятаў у праваслаўе. «Дзеўяць ягодзін на ветцы».

**2. пт.** ***Дзевятуха.** Дзень засцеражэння ад навальніцы.

**6. а. Купалле**. Свята Сонца і кахання. «Дзень адбаўленне, ночы прыбаўленне».

**7. с. Іван Купала.** «Учора была Купала, а сёння Іван».

**8. ч.** ***Дзясятнік.** «Дзясятнік гнаі возіць». ***Данат***. «Святы Данат коскі точыць».

**9. пт.** ***Дзясятка.** «Косы точыць». «Жыта паспявае».

**10. пт. Самсон.** «На Самсона дождж — сем тыдняў то ж». ***Сем братоў.*** «Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды».

**12. п. Пятро.** Свята заканчэння Купалля.

**13. а. Паўпятро.** Дзень талакі. **Сымон і Юда.** «На Сымана й Юды конь баіцца груды».

**14. с. Кузьма і Дзям'ян.** Свята кавалёў. «Святы Пятро жыта спеліць, св. Кузьма сярпы робіць, а св. Дзям'ян сена грабе».

**17. сб. Андрэй.** «Авёс у світцы, а на грэчцы і кашулі няма». «Андрэй усіх мудрэй».

**18. н. Свята Месяца.** «Месяц гуляе».

**21. с. Казанская, Градавы дзень.** Засцераганне ад нябесных стыхій, ад хвароб вачэй і галавы. **Пракоп**. Пракоп бок прыпёк.

**25. н. *Якуб.*** «На Якуба хлеба поўна губа». **Прокл.** Засцерагаліся вялікіх рос.

**26. п. *Ганна.*** Снапы кладзе. **Гаўрылей.** Засцеражэнне ад граду.

**29. ч. Афінаген.** Заціхаюць птушкі.

**30. пт. Серпавіца, Шыпілінка** (пятніца перад Іллёй). Дзень «зазубрывання» сярпоў перад жнівом.

## Жнівень

**1. н. Макрыны.** «Глядзі восень па Макрыні».

**2. п. Ілля.** Свята дажджоў і навальніц. «Ілля нарабіў гнілля». «Укінуў у воду кусок ільда».

**4. с. Мар'я.** «Магдалена — вады па калена».

**6. пт. Барыс Палікоп.** «Барыс і Глеб — паспеў хлеб».

**7. сб. Ганны.** «Святы Ганны бабкі стаўляюць».

**9. п. Палікоп.** Паліць копы. **Панцеляймон.** Сцаляў ад хвароб галавы.

**10. а. *Лаўрын.*** «На Лаўрына спяшай да млына».

**12. ч. Сіла.** Жыта сей.

**14. сб. Макавей, Першы Спас.** Свята маку і мёду. **Спасаўка.** Пост да 27 жніўня.

**15. н. *Прачыстая, Зельная.*** «Прыйшла Прачыста — стала поле чыста». **Базыль.** «Базыль авечкам воўну дае».

**16. п. Антоны Віхравеі. Рох.** «Кірмаш на паненак» — дзень выглядання нявест.

**17. а. Еўдакія.** Агуркі збірае.

**19. ч. Яблычны Спас.** Свята садавіны.

**23. п. Лаўрэн** — свята млынара. «Баўтрамей і Лаўрын паказваюць, якая прыйдзе восень».

**24. а. *Баўтрамей.*** «Св. Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей». «Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей».

**27. пт. Міхей.** Выспяваюць брусніцы.

**28. сб. Прачыстая, Зельная.** Свята ўраджаю.

**29. н. Трэці Спас.** Свята хлеба. **Ян.** «Ян на лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў».

**30. п. Міроны Ветрагоны.** «Пыл па дарозе гоняць, па прыгожым леце стогнуць».

**31. а. Флор і Лаўр.** Свята коней. **Арабінавыя дзень і ноч.** Сухая навальніца, або дождж.

## Верасень

**5. н. Лупа.** «Сей на Лупа — будзе жыта купа».

**7. а. Баўтрамей.** «Жыта на зіму сей».

**8. с. *Другая Прачыстая.*** «Меншая Прачыста — канчай сеяць начыста».

**10. пт. Мацей**. Абаронца ад п'янства.

**11. сб. Калінавік, Іван Крываўнік.** «Да Яна прасіце, дзеткі, дажджу, а па Яне я й сам упрашу».

**13. п. Кіпрыян.** Журавель збіраецца ў выраі.

**14. а. *Узвіжанне.*** Закрыванне зямлі. **Сымон.** Абрад «жаніцьбы коміна». (Асенняе Навалецце / Навагоддзе з 1493 г.). **Бабіна лета.**

**19. сб. Цуды, Міхал.** «Міхал з поля спіхаў».

**21. н. Багач, Нараджэнне Божае Маці.** Свята заканчэння ўборкі зерневых. Засідкі.

**22. п.** *Асенняе раўнадзенства ў 19.21г.*

**24. пт. Тадора.** «На Тадору ўсякае лета заканчваецца».

**26. н. Стаўроўскія Дзяды**

**27. п. Звіжанне.** Свята закрывання зямлі на зіму. Гадзюкі збіраюцца ў кучу.

**29. с. *Міхал.*** «Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то не май на надвор'е надзеі». **Сіцыян.** «Святы Сацыян ды ляны пасцілаў».

## Кастрычнік

**2. сб. Зосім.** Журавіны на Зосіма ўздымаюцца — мароз на Пакровы ўдарыць.

**3. н. Астап, Астаф'я.** Прыкметы па ветру.

**4. п. *Пранцішак, Францішак.*** «На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка».

**8. пт. Сяргей.** «З Сяргея пачынаецца зіма». **Жалезны тыдзень.** Чысцілі жалезныя рэчы.

**9. сб. Іван Шаптун, Іван Кураед, Багаслоў.** Шапталіся сваxі пра нявест. «Іван Багаслоў дружкі разаслаў, а на Пакрова дзеўка гатова». «Святы Б. да буракі капаў».

**14. ч. Пакровы, Трэцяя Прачыстая.** Вясельная пара. «Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку — вяночкам». «Пакровы — зарыкалі каровы». **Дзявоцкае лета** (па 21.10). Прымалі «ў дзеўкі» сяброўак.

**21. ч. Трыфан, Палагея.** «Золкім ветрам вее». ***Зміцер.*** «Да Змітра баба хітра».

**25. п. Марцін** — свята млынароў. Частаваліся гусяцінай на млынавым крузе. «Марцін святы — любіцель гагаты».

**28. ч. *Сымон і Юда.*** «Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць». ***Параскева Пятніцкая.*** Забарона на прадзенне.

**29. пт. Лонгін.** Збавіцель ад хвароб вачэй.

**30. сб. Паклоны.** Дзень адбівання паклонаў.

**31. н. Лука.** «Хто сее да Лукі, не будзе мець ні хлеба, ні мукі». Дзень іканапісцаў. ***Юльян*** - ахоўнік дзяцей.

## Лістапад

**1. п. *Усе святыя.***

**2. а. *Задушны дзень.*** Памінальны дзень.

**4. ч. Казанская.** «Да Казанскай — не зіма, а пасля — не восень; зранку дождж, з вечара — снег. Выязджай на Казанскую на калёсах, а палазы з сабой прыхапі».

**6. сб. Асяніны, Змітраўскія Дзяды.** «Святыя дзяды, завём вас...».

**8. п. Зміцер.** «Да Змітра дзеўка хітра». Канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе.

**9. а. *Тодар.*** «На Тадора поўна камора».

**10. с. Параскі.** Апякунка жанчын і рукадзелля.

**11. ч. Настуся.** Настуся стрыжэ авечкі. ***Марцін.*** «Мядзведзь кладзецца ў бярлогу».

**12. пт. Артошка.** Пачатак прадзення.

**14. н. Кузьма-Дзям'ян.** Апякун земляробства, кавалёў і вяселля.

**21. н. Міхайлаў дзень.** Абаронца ад грому. Мядзведзі ідуць у спячку.

**22. п. Матрона.** «З Матроны становіцца зіма».

**24. с. Хвёдар Студзянец.** «Хвёдаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць».

**25. ч. *Кацярыны.*** «Кацярына забрала лета». **Іван Міласцівы.** Дзень падарункаў.

**27. сб. Юстыніян.** Апякун плоднасці і дзяцінства. **Піліп.** Пярэдадзень Піліпоўскага посту (да 7 студзеня).

**28. н. Піліпаўка** - перадкалядны пост (да 06.01).

**29. п. Мацей.** «На Мацея зіма пацее».

**30. а. *Андрэйкі*.** Дзявочае свята.

## Снежань

**4. сб. *Барбара.*** «Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла». **Уvядзенне.** Водзяцца ваўкі.

**5. н. Пракоп. *Савы.*** «Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае».

**6. п. *Мікола.*** «Хвалі зіму па Міколе». **Матрыхваны.** Не пралі.

**7. а. Кацярыны.** «Забрала край лета».

**9. ч. Юр'е Зімовы.** Юра мосціць. ***Ганны.*** «Ад Ганны да Каляд два тыдні і два дні».

**13. п. Андросы, Андрэйкі.** Варажылі.

**14. а. Навум.** «Наставіць на вум». Пачыналі вучыць дзяцей грамаце.

**17. пт. Варвары**. «Мікола і Варвара ноч урвалі».

**18. сб. Савы, Міколін бацька.** «Сава мосце, а Мікола гвоздзе».

**19. н. Мікола Зімовы.** «Без Міколы небывае ні зіма, ні лета». «Мікола марозам гвоздзіць».

**21. а.** *Зімовае сонцастаянне ў 15.59 г.*

**22. с. Ганны.** «Ганны — прыбавіцца багата дня». «Ганкі — палічаны дзянькі».

**24. пт. *Посная куцця.*** Пачатак Каляд (да 6 студз.).

**25. сб. *Божае Нараджэнне.*** Было Новым годам. «Свята Ражаство упярод пашло, новы гадок павёў радок». **Спірыдон Сонцаварот.**

**26. н. *Сцяпан.*** Дзень найму батракоў у мінулым. «Кожны сабе пан».

**31. пт. *Багатая куцця. Сільвестр.*** Варажылі дзяўчаты. **Марк.** «Марка да Варка — няхай будзе парка».

**Алесь ЛОЗКА, фалькларыст**

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Галоўны рэдактар** — КРЫВАНОС Аляксандр Паўлавіч; **намеснік галоўнага рэдактара** — Юрый КАРПЕНКА; **адказны сакратар** — Таццяна ПАШЭНЬКА; **рэдактар аддзела:** Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Зміцер ЮРКЕВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Надзея КУДРЭЙКА, Антон РУДАК, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльны карэспандэнт:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
**Дырэктар** — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
**першы намеснік дырэктара** — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
**Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.**
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2020.
Наклад 3077. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 30.12.2020 у 18.00. Замова 11.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

КУЛЬТУРА

# 2021 СТУДЗЕНЬ



Ісаевіч Галіна Анатольеўна. Дэкаратыўны набор «Сапфір», 1972 г. *Каляровае шкло; глыбокая грань.*



**Мягкова Людміла Міхайлаўна. Дэкаратыўная кампазіцыя «Елкі», 1989 г.** *Каляровае шкло, бясколернае шкло, малочнае шкло; гута.*

Гэты месяц сімвалізуе сабой лічбу "1" — першы, што адкрывае год. А ў ім ужо дамінуе лічба "12". Людзі з нейкіх прычын шануюць лічбу "12". Дванаццаць знакаў Задыяка, дванаццаць месяцаў, дванаццаць гадзін у дні і начы. Тыя, хто схільны ва ўсім бачыць містычны сэнс, лічаць, што "12" — гэта ўвасабленне касмічнага ладу, сусветнай гармоніі. Гэта сакральная лічба праходзіць праз міфалогію светабудовы бадай усіх народаў свету. Нашы продкі, што шмат стагоддзяў таму атабарыліся на гэтай зямлі, — не выключэнне. А праз сваю блізкасць да прыроды, нават праз тоеснасць з ёй, продкі далі дванаццаці ўмоўным адрэзкам года назвы, адпавядаючыя прыродным з'явам. У назвах зімовых месяцаў — эскалацыя холаду. Мабыць, крышталь як ніякі іншы выяўленчы сродак дэкаратыўнага мастацтва выяўляе зіхатлівасць, іскрыстасць студзеня.

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

КУЛЬТУРА

# ЛЮТЫ 2021



**Леантовіч Валерый Аляксеевіч — аўтар формы.**
**Данчук Вікторыя Яфімаўна— аўтар малюнка роспісу. Чайны сервіз «Шэрань», 1986 г.** *Фарфор; адводка золатам, крыццё кобальтам, дэколь.*

Гэты месяц таксама “крышталёвы”. Хіба з той розніцай, што “крышталь” не празрысты, як у студзені, а прыгожа замутнёны, “мацІраваны” завеямі і... чаканнем непазбежнага надыходу вясны. “Люты сцюжамі лютуе — ад вясны снягі вартуе”, кажа народ. “Студзень студзіць рунь густую. Люты злосны, ён лютуе”, — падсумоўвае сялянскі досвед Рыгор Барадулін. Люты — памежжа зімы і вясны, якое так любіў маляваць наш геній Вітольд Бялыніцкі-Біруля. Праўда, у гарадах, якія прынята называюць “другой прыродай, — а яна адносна “першай” ці не суцэльная анамалія, мы можам і не заўважыць, як студзень пераходзіць у люты, а люты ў сакавік. Бо каб даведацца пра надвор'е часцей глядзім не на неба, а ў інтэрнэт.



**Мягкова Людміла Міхайлаўна. Дэкаратыўная кампазіцыя «Іней», 1999 г.** *Бясколернае шкло; матаванне.*

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | | | | | | | |

КУЛЬТУРА

# САКАВІК 2021

“Згінулі сцюжы, марозы, мяцеліцы,
Болей не мерзне душа ні адна.
Сонейкам цёпленькім, зелянню вабнаю
Абдаравала зямельку вясна.”

Так сказаў пра вясну Янка Купала. Ягоная творчасць у пэўнай ступені паспрыяла ператварэнню сялянскага этнасу ў мадэрную, гарадскую нацыю. Але канкрэтна прыроду наш геній успрымаў з гледзішча вяскоўца — як чалавек, добра дасведчаны ў працы на зямлі. Гараджанін у гэтых радках убачыць вясну ўвогуле, а вось вясковец яшчэ і канкрэтны месяц ці нават тыдзень часу абуджэння прыроды пасля зімовага сну. Вясновыя фарбы маюць прыцягальную, магічную сілу. На тле надакучлівай, адыходзячай манахромнасці зімы нават сціплыя парасткі шматквецця глядзяцца больш натхняльна і ўрачыста, чым раскошныя фарбы апагея лета.



**Грыцкоў Леанід Васільевіч. Дэкаратыўны набор «Жнівень», 1984 г.** *Гліна, паліва; лепка.*



**Грыцкоў Леанід Васільевіч. Дэкаратыўны набор «Бярэзіна», 1985 г.** *Дрэва, бісквіт, лаза; солі, хімічны фарбавальнік.*

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

КУЛЬТУРА

# КРАСАВІК 2021



Абрамава Антаніна іванаўна. Ваза, блюда «Сланечнік», 1960 г. *Жоўты крышталь; грань.*



**Мягкова Людміла Міхайлаўна. Дэкаратыўная бутыль «Кветкі на асфальце», 1985 г.**
Дымчатае шкло, гута; матаванне.

Вясна ўжо ўсталявалася, але як і ў сакавіку ўсё яшчэ чутно, хай і цішэй, водгулле зімы. Рэдка, але здараюцца нават замаразкі. І ўсё ж колераваю гаму чацвёртага месяца года вызначае не пахмурнае неба з праблісками блакіту, а сонца, якое трывала замацоўваецца на небасхіле.
"Следам з краскай красавік, і лясун, і палявік" — гэта зноў Рыгор Барадулін і ягоны верш "Год-карагод". У красавіку горад пачынае масава выпраўляцца на прыроду, на лецішчы. Але па вясне і ў гарадах назіраецца, як кажуць, "двіж". Падаецца, што вясне найбольш радуюцца жанчыны, якія восенню і зімой вымушаны хаваць прыгажосць пад цяжкія паліто і футры. І вось здараецца нагода — раскрыцца як кветка пад сонцам.

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |

КУЛЬТУРА

# МАЙ 2021



**Мягкова Людміла Міхайлаўна. Дэкаратыўная кампазіцыя «Вясновая песня», 1988 г.** *Каляровае шкло; гута.*



**Мягкова Людміла Міхайлаўна. Дэкаратыўная кампазіцыя «Раніца туманная», 1999 г.** *Каляровае шкло, бескаляровае шкло; гута, матаванне.*

Ён жа ТРАВЕНЬ. Адносна нядаўна ў нашай свядомасці гэты месяц меў колер спрэс чырвоны. 1 Мая — Дзень сусветнай салідарнасці… Цяпер жа на першы план зноў выйшлі ягоныя натуральныя, прыродныя колеры яркіх кветак сярод зялёнай травы. Але гэта яшчэ і 9 Мая — Дзень Вялікай Перамогі, адна з самых памятных дат нашага гістарычнага календара. Мабыць, калі не назаўсёды, дык на доўгі час гэты месяц будзе для нас і “траўнем” — сымбалем цвіцення, бурлівай маладосці напярэдадні, дай Божа, мудрай сталасці, і маем Перамогі — успамінам пра тое, як мы здолелі выстаяць у жорсткім выпрабаванні і выратаваць свет. Спалучэнне “травень-май” у нашым лёсе і ў нашай мове зусім невыпадковае.

| Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

КУЛЬТУРА

# ЧЭРВЕНЬ 2021



**Мягкова Людміла Міхайлаўна. Дэкаратыўная кампазіцыя «Вецер», 1981 г.** Каляровае шкло, бескаляровае шкло; гута, прылепы.



**Сазыкіна Вольга Юр'еўна.**
**Дэкаратыўнае блюда, 1980 г.**
*Каляровае шкло, бясколернае шкло; фактурызацыя шклотканінай.*

Пачатак лета і сярэдзіна года. Самы доўгі дзень і самая кароткая ноч. Купальская ноч, калі, згодна з легендай, расцвітае Папараць-кветка. Паводле законаў прыроды папараць не цвіце. З іншага боку, на працягу гісторыі і беларусы як народ неаднаразова маглі знікнуць, растварыцца сярод суседзяў. Але і папараць цвіце, і Беларусь існуе. І будзе жыць!

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | | | |

КУЛЬТУРА

# 2021 ЛІПЕНЬ



**Мягкова Людміла Міхайлаўна. Дэкаратыўная кампазіцыя «Кветкі лугавыя», 1986 г.** *Каляровае шкло, бескаляровае шкло, каляровая крошка; гута, матаванне.*



**Грыгарышына Валянціна Іванаўна. Форма 1 з дэкаратыўнай кампазіцыі «Папараць-кветка. Дзень» (з 3 прадметаў).** Шамот, соль, глазур; глянцгольд.

Сярэдзіна лета і паварот на зіму, а для пачатку — на восень. Як і чэрвень — гэта час, калі нашы суайчыннікі імкнуцца атрымаць працоўны адпачынак і за адсутнасцю ў нашай краіне марскога ўзбярэжжа і іншай экзотыкі правесці яго за межамі краіны — там, дзе цёплае мора. Але апошнім часам па незалежным ад нас прычынах вандроўкі за межы Беларусі сталі небяспечнымі для здароўя і нават жыцця. Праз гэта беларусы скіравалі свой вандроўны імпэт на родны край і адкрылі для сябе… Беларусь. Убачылі родны край у новых фарбах. Ёсць спадзяванні, што гэта тэндэнцыя набудзе ўстойлівасць і будзе мець працяг, нават калі ў навакольным свеце ўсё ўсталюецца найлепшым чынам.

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

КУЛЬТУРА

# ЖНІВЕНЬ 2021



**Гаўрылаў Віктар Георгіевіч — аўтар формы. Літвіненка Ганна Васільеўна — аўтар роспісу. Чайнік «Ураджайны», 1970 — 1980 гг.** Фарфор; надглазурны паліхромны роспіс, дамалёўка золатам, стракатанне.



**Сотнікаў Аляксей Георгіевіч — аўтар мадэлі; скульптар-анімаліст, заслужаны мастак РСФСР; Дулеўскі фарфоравы завод. Скульптура «На птушніку», 1955 г.** *Фарфор; надглазурны роспіс, дамалёўка золатам.*



**Малышаў Леанід Рыгоравіч — аўтар формы і малюнка. Набор для напояў «Рагуля», 1996 г.** *Фарфор; падглазурны роспіс, дамалёўка золатам, стракатанне.*

Як вынікае з назвы — час жніва. Гэтым, бадай, усё і сказана. У плане метафізічным жнівень — гэта памежжа маладосці і сталасці. У сэнсе канкрэтным жнівень можа быць вяртаннем на працу пасля адпачынку, а па жыцці гэта патрэба азірнуцца на засвоенае і здзейсненае з разуменнем, што ты ўжо досыць дарослы, каб жыць сваім розумам. Час добры, але крыху сумны. “А ўсё ж такі шкада, што скончылася лета…” — спяваў славуты бард савецкай пары. І насамрэч шкада.

| Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

КУЛЬТУРА

# ВЕРАСЕНЬ 2021



Угрыновіч Уладзімір Вікенцьевіч. Дэкаратыўная кампазіцыя «Стварэнне свету». *Гліна, глазур; лепка, абпал, кракле.*



**Сазыкіна Вольга Юр'еўна. Дэкаратыўная кампазіцыя «Расліны Палесся», 1985 г.** *Каляровае шкло; аўтарская тэхніка.*

Календарная восень. Колеравае кола павярнула з зялёнага на жоўтае, далей на аранжавае, потым на чырвонае. Мастакі, звяртаючыся да тэмы восені, звычайна малююць дары зямлі руплівому гаспадару вясковай сядзібы ці эфектныя краявіды з колеравамі дысанансамі. А ў плане сацыяльным верасень — пачатак заняткаў у школе. Для дарослых, асабліва для тых, хто адпраўляе сваіх сына ці дачку "першы раз у першы клас", — Дзень ведаў, так афіцыйна называецца дзень 1 верасня, падстава азірнуцца на ўласнае дзяцінства, прыгадаць сябе першакласнікам.

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

КУЛЬТУРА

# КАСТРЫЧНІК 2021



Кузняцова Ірына Іванаўна. Дэкаратыўны набор «Вецер», 1980 г. *Каляровае шкло, бескаляровае шкло; выдзіманне.*



**Мурахвер Уладзімір Сямёнавіч. Дэкаратыўная кампазіцыя «Сіла зямлі», 1978 г.** *Матаванае шкло; гута, маліраванне.*

У тапаніміцы, бадай, кожнага больш-менш значнага беларускага паселішча ёсць што-небудзь звязанае з кастрычнікам 1917 года. У нашай сталіцы гэта раён, вуліца, плошча, кінатэатр. Кастрычнік у палітычнай свядомасці беларускай грамады за савецкім часам і ў першыя гады Незалежнасці стаяў у адным шэрагу з маем, і колер меў адпаведны. Колер Чырвонага сцяга. Сёння для нас больш актуальна тое, што гэты месяц у беларускім нацыянальным календары звязаны, прычым здаўна, не са стрэлам “Аўроры” па безабаронным палацы і штурмам Эрмітажа ў Санкт-Пецярбурзе, сталічным горадзе Расійскай імперыі, але са звыклай сялянскай працай. У гэты восеньскі час сяляне трапалі, часалі лён і каноплі, з якіх ападала шмат кастрыцы.
У нас на кастрычнік прыпадае свята Пакровы. Казалі, “Святы пакроў пакрыў зямлю жоўтым лістом, маладым сняжком, ваду — лёдам, пчалу — мёдам, дзеўку — вянком…”

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

КУЛЬТУРА

# 2021 ЛІСТАПАД



**Арцёмава Таццяна Андрэеўна. Дэкаратыўны набор «Яблыневы колер», 1976 — 1977 гг.** *Бескаляровы крышталь, рубінавае шкло; хімічная паліроўка, алмазная грань, пескаструйная апрацоўка, гута.*

Назва гаворыць сама за сябе. У лістападзе ападае лісце, агаляюцца дрэвы. Выразны знак, што зіма на падыходзе. Праз дзівосы нашага надвор'я ў лістападзе часам бывае халадней, чым у студзені. Тут, мабыць, спрацоўвае яшчэ і псіхалагічны момант. Па зіме снег — нармальная з'ява. А калі толькі што было адносна цёпла, і раптам снег... Няўтульна неяк. Зразумела, што сонечнае надвор'е людзям больш да спадобы. Але ёсць гарады, якім пасуе менавіта восень, якім дождж і нізкае неба надаюць асаблівую выразнасць, выклікаюць згадкі пра іх даўнюю гісторыю, пачатак якой губляецца ў глыбіні стагоддзяў. Ёсць такія гарады і ў Беларусі.



**Літвіненка Ганна Васільеўна. Чайны сервіз «Блакітны пейзаж», 1991 г.** *Фарфор; надглазурны роспіс.*

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз | Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | | | | |

КУЛЬТУРА

# СНЕЖАНЬ 2021



**Раудвеэ Сільвія Янаўна. Дэкаратыўны набор «Арктыка», 1968 г.** *Бескаляровы крышталь; алмазная грань, пескаструйная апрацоўка.*



**Ісаевіч Галіна Анатольеўна. Дэкаратыўны набор «Серабрысты іней», 1980 г.** *Бескаляровы крышталь; граненне.*

Зімой год распачаўся, зімой і канчаецца. Сумна і адначасова радасна, бо наперадзе Каляды, Новы год — святы, да якіх прызвычаіліся з дзяцінства і ад якіх нават пры самым прагматычным складзе розуму чакаеш цуду. Гэта нейкае падабенства такога інтымнага свята, як твой дзень нараджэння, які дзіўным чынам супадае з днямі нараджэння мільёнаў людзей ва ўсім свеце. На Каляды, на Новы год мы ўсе, хто згодны з календаром — імяніннікі. А прыпадае самае цёплае свята на самую халодную пару года. Хтосьці гэта вельмі хораша прыдумаў. Студзеньскім святам вельмі пасуе зіхатлівы крышталь. У спалучэнні з агнём у каміне і сцюжай за акном.

*Рэдакцыя “К” выказвае словы шчырай падзякі кіраўніцтву і супрацоўнікам Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь за прадстаўленне ілюстрацыйнага матэрыялу.*

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

## МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 397 01 63 (экскурсійнае бюро)*
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".
Выставы:
■ Выстава твораў Дар'і Карпавай **"Вітамін Ж(ывапіс)"** — да 10 студзеня 2021-га.
■ Сумесны культурна-адукацыйны праект-квэст Нацыянальнага мастацкага музея і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны **"Аб Вялікай Айчыннай..."**
■ **"Фердынанд Рушчыц"**: віртуальная выстава да 150-годдзя з дня нараджэння.
■ Віртуальная выстава **"Юбілей беларускага камсамола"**.
■ Віртуальная выстава **"Юбілей беларускага камсамола"** прысвечаная 100-годдзю ЛКСМБ — на сайце музея.
■ Выстава **"Фарбы як гукі: аб чым гавораць карціны глухіх дзяцей?"** — з 10 снежня.
■ Выстава **"Ян Дамель. Палатно. Папера. Лічба"** — да 27 студзеня.
■ Выстава **"Твары родных людзей. Жывапіс Юрыя Піскуна"** — да 4 студзеня.
■ Выстава беларускага мастака Мікалая Кузьміча **«Byzantium»**— з 2 снежня.
■ Выстава **"Мастакі маладзечанскага краю"** — да 4 студзеня.
■ Віртуальная выстава **"Лявон Баразна. Беларускі народны арнамент Палесся"** — да 14 стузеня.

*Філіялы музея*
МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."
*г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 358 88 78*
■ Калядная праграма "у гасцях у казкі" 11.12. Пачатак а 17-й.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
■ Выстава **"Эпоха рамантыкаў. Ваньковіч і яго час"** — да 19 лютага 2021-га.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
*Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Повязь часоў"**, якая знаёміць з багаццем вобразаў традыцыйнага ручніка.
■ **Займальныя майстар-класы** па саломапляценню, вырабу традыцыйных лялек, пляценні паясоў (бранзалетаў). Патрапіць на майстар-клас можна ў любы працоўны дзень музея: серада-нядзеля з 10.00 да 17.00. Папярэдні запіс абавязковы.
■ Праграма **"На Каляды ў музей"** (транспарт ад школы да музея і назад, экскурсія, майстар-клас па саломапляценні, выступленне калядоўшчыкаў, майстар-клас па традыцыйных танцах, народныя гульні, пачастунак). Папярэдні запіс абавязковы.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск,вул. Някрасава, 3*
*Тэл.: 399-09-79*
*Час працы: серада-нядзеля з 12:00 да 20:00*
■ Выставачны праект **"Новы год. Анталогія свята"**.
■ Выстава адной карціны.
■ Выстава Максіма Петруля **"Максімалізм"**.
■ Выстава **"Трыццаць тры творы. Выстава набыткаў музейнага зборы НЦСМ"**.
*г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47*
*Тэл.: 242-78-14*
*Час працы: аўторак-нядзеля 12.00-20.00*
■ Выстава **"Лінія любові. Эратызм у творчасці вялікіх майстроў XX стагоддзя"**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
*г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8. Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66. Музей працуе: аўторак, серада, пятніца, субота, нядзеля — з 10.00 да 18.00 (касы да 17.30), чацвер — з 12.00 да 20.00 (касы да 19.30) панядзелак — выхадны.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Інтэрактыўная праграма **"Палёт у Новы год"** — 5,6 студзеня.
■ Экспрэс-выстава **"Музей у чамадане"** (выязная ўслуга) — да 31 мая.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
*г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.*
*Палацавы ансамбль*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выставачны праект **"Сапраўднае"** мастакоў міжнароднага грамадскага аб'яднання "Еўразійская мастацкая садружнасць" — да 28 лютага 2021-га.
■ Выставачны праект **"Пасядзім з густам!"** (фатэлі і крэслы XVIII — XX стст. з фондаў музея-запаведніка) + квэст-віктарына **"Пасядзім, падумаем"**. Па папярэдніх заяўках. Да 5 красавіка 2021-га.
■ Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"**. У складзе пастаяннай экспазіцыі.
■ Міжнародны выставачны праект **"Даспехі радзівілаўскага Нясвіжа"** (артэфакты з калекцый Музея Фіцвільяма Кэмбрыджскага універсітэта, Нацыянальнага гістарычнага музея і Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж"). У складзе пастаяннай экспазіцыі.
*Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці*
*Вул. Гейсіка, 1.*
*Ратуша*
*г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Квэст **"Выходкі старога захавальніка"**. Па папярэдніх заяўках.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
*г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 90, (8–01596) 2 82 70.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Тэатралізаваная экскурсія **"Мірскі замак і яго ўладальнікі: шлях праз стагоддзі"**.
■ Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
■ Экскурсія з элементамі анімацыі і дэгустацыі **"Мірскі замак. Гісторыя. Культура. Дэгустацыя"**.
■ Тэматычная экскурсія з элементамі квэста для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
■ Музейныя камунікатыўныя праграмы: **"Табе, нашчадак, у добры дар…", "Ад усяго сэрца — самы лепшы пачастунак", "Капрызы моды ракако"**.
■ Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
■ Правядзенне вясельных цырымоній, святкаванне гадавіны вяселля.
■ Музейная фотапляцоўка.
■ **Восеньскі сезон канцэртаў Белдзяржфілармоніі.**
■ **Квэст "Таямніца двух куфраў"**.

**ПА ПЫТАННЯХ РАЗМЯШЧЭННЯ РЭКЛАМЫ Ў ГАЗЕЦЕ "КУЛЬТУРА"**
**звяртайцеся па тэлефоне**
+ 375 17 286 07 97
**і па тэлефоне/факсе**
+375 17 334 57 41
**альбо пішыце на электронны адрас**
kultura@tut.by!









Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ і Наталлі ОВАД.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

магазіны "Белсаюздрук"
**Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".**
**Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".**
**Праспект Незалежнасці, 44.**
**Вуліца Валадарскага, 16.**

кіёскі "Белсаюздрук"
**ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.**
**Праспект Пераможцаў, 5.**
**Вуліца Рабкораўская, 17.**
**Праспект Незалежнасці, 68, В.**
**Вуліца Лабанка, 2.**

## ТЭАТРЫ

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
*г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.*
■ **2, 5 —** Канцэрт-сюрпрыз **"Навагодні маскарад"** (з удзелам зорак оперы і балета Вялікага тэатра Беларусі). Дырыжор — Алег Лясун. Пачатак а 16-й і ў 20.00.
■ **3 — "Пінокія"** (опера ў 2-х дзеях) Г.Бруні. Дырыжор — Дзмітрый Мацвіенка. Пачатак аб 11-й і а 14-й.
■ **3 — "Жызэль або Вілісы"** (балет у 2-х дзеях) А.Адана. Дырыжор — Мікалай Калядка. Пачатак у 19.00.
■ **6, 8 — "Папялушка"** (балет у 3-х дзеях) С.Пракоф'ева. Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак у 19.00.
■ **8 — "Тры парасяці"** (балет у 2-х дзеях) С.Кібіравай. Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак у 19.30.
■ **8 —** Блакітны агеньчык. Пачатак у 19.30.
■ **9 — "Чароўная музыка"** (опера-казка ў 2-х дзеях) М.Мінкова. Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак а 12-й.
■ **9 — "Іаланта"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага. Дырыжор — Алег Лясун. Пачатак у 19.00.

**ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"**
*г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 154 04 44.*
■ **4 — "Сіроха"** (жыццё ў дзвюх эпохах) Ю.Чарняўскай. Перанос з 16.12.2020.
■ **5 — "Навагоднія прыгоды ў Віртулянды"** (музычны спектакль для дзяцей і дарослых) І.Пятрова.
■ **5 — "Мудрамер"** (сатырычная камедыя) М.Матукоўскага.
■ **6 — "Навагоднія прыгоды ў Віртулянды"** (музычны спектакль для дзяцей і дарослых) І.Пятрова.

**ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"**
*г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.*
■ **2, 3, 4, 9 — "Чароўная сняжынка"** (навагодні спектакль і забаўляльная праграма для дзяцей ад 3-х гадоў). Пачатак аб 11-й, а 14-й і ў 17.30.

**ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.**
**З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").**